Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б)Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 33 (53) Нядзеля, 19 жніўня 1945 г. Цана 15 кап.

## БЕЗАГАВОРАЧНАЯ КАПІТУЛЯЦЫЯ ЯПОНІІ

14 жніўня Урад Злучаных Штатаў атрымаў праз швейцарскі ўрад наступнае паведамленне ад японскага ўрада:

„Па пытанню аб Н о ц е японскага ўрада ад 10 жніўня адносна прыняцця ўмоў Патсдамскай Дэкларацыі і адказа Урадаў Злучаных Штатаў, Вялікабрытаніі, Савецкага Саюза і Кітая, пасланага дзяржаўным сакратаром Амерыкі Бернсам і датыраванага 11 жніўня, Японскі Урад мае часць паведаміць Урадам чатырох дзяржаў наступнае:

1. Яго Вялікасць Імператар выдаў Імператарскі рэскрыпт аб прыняцці Японіяй умоў Патсдамскай Дэкларацыі,

2. Яго Вялікасць Імператар гатоў санкцыяніраваць і забяспечыць падпісанне Я г о Урадам і Імператарскай Генеральнай штаб-кватэрай неабходных умоў для выканання палажэнняў Патсдамскай Дэкларацыі. Яго Вялікасць таксама гатова даць ад сябе загады ўсім ваенным, ваеннамарскім і авіяцыйным уладам Японіі і ўсім находзячымся ў іх падчыненні ўзброеным сілам, дзе-б яны ні знаходзіліся, спыніць баявыя дзеянні і здаць зброю, а таксама даць такія другія, загады якія можа патрабаваць Вярхоўны Камандуючы Саюзных Узброеных сіл у мэтах ажыццяўлення вышэйуказанных умоў.

## Растлумачэнне Генеральнага Штаба Чырвонай Арміі аб Капітуляцыі Японіі

З прычыны паступаючых запросаў па поваду капітуляцыі Японіі Начальнік Генеральнага Штаба Чырвонай Арміі генерал арміі АНТОНАЎ РАСТЛУМАЧВАЕ:

1. Зробленае японскім імператарам 14 жніўня паведамленне аб капітуляцыі Японіі з'яўляецца толькі агульнай дэкларацыяй аб безагаворачнай капітуляцыі.

Загад узброеным сілам аб спыненні баявых дзеянняў яшчэ не аддан і японскія ўзброеныя сілы па ранейшаму прадаўжаюць супраціўленне,

Значыць, сапраўднай капітуляцыі ўзброеных сіл Японіі яшчэ няма,

2. Капітуляцыю ўзброеных сіл Японіі можна лічыць толькі з таго моманту, калі японскім імператарам будзе дан загад сваім узброеным сілам спыніць баявыя дзеянні і зложыць зброю і калі гэты загад будзе практычна выконвацца.

3. З п р ы ч ы н ы сказанага ўзброеныя с і л ы Савецкага Саюза на Далёкім Усходзе будуць прадаўжаць свае наступальныя аперацыі супроць Японіі.

## У Выканкоме райсовета дэпутатаў працоўных і РК КП(б) Беларусі

Выканком райсовета дэпутатаў працоўных і РК КП(б)Б разгледзелі вынікі соцыялістычнага спаборніцтва паміж сельсоветамі за датэрміновае выкананне хлебапаставак па становішчу на 15 жніўня г. г.

Пераходны Чырвоны Сцяг райвыканкома і РК КП(б) Б прысуджан Грыўдзенскаму сельсовету (старшыня Выканкома сельсовета т. Крокас), які на 15 жніўня выканаў план хлебаздачы на 29 проц., і заняў першае месца ў раёне.

Выканком райсовета дэпутатаў працоўных і РК КП(б)Б адзначылі добрую работу ў справе выканання хлебанарыхтовак Выканкомаў Івацэвіцкага пасялковага совета (старшыня т. Рэкіш) і Яблонскага сельсовета (старшыня т. Барсук).

## Шырыць Соцыялістычнае спаборніцтва на хлебанарыхтоўках

Паспяхова закончыўшы ўборку багатага ўраджаю, сяляне і сялянкі нашага раёна прыкладаюць усе сілы, каб датэрмінова разлічыцца з дзяржавай па хлебанарыхтоўках. Кожны селянін, кожная сялянка добра разумеюць, што чым хутчэй яны выканаюць свае абавязацельствы перад радзімай, тым мацнейшай і багацейшай будзе наша совецкая дзяржава.

Разгорнутае ў раёне соцыялістычнае спаборніцтва за хутчэйшае выкананне плана хлебанарыхтовак паміж сельсоветамі падняло на высокую ступень ініцыятыву нашых сялян і сялянак у справе здачы хлеба дзяржаве. На 18 жніўня Івацэвіцкі пасялковы совет выканаў план хлебаздачы на 100 проц.

Поўнасцю разлічыліся па хлебапастаўках сяляне в. Яблонка Яблонскага сельсовета, вёскі Дубітана Грыўдзенскага сельсовета і вёскі Галынка Бусяжскага сельсовета, Добра ідуць хлебанарыхтоўкі ў Яблонскім, Белавіцкім, Любішчыцкім і другіх сельсоветах,

Аднак у раёне ёсць і адстаючыя сельсоветы. Так Альбінскі сельсовет план хлебанарыхтоўкі на 18 жніўня выканаў толькі на 52 проц., Бусяжскі на 54 проц. Косаўскі—на 64 проц. Адстаюць і некаторыя другія сельсоветы,

Нарыхтоўка хлеба—важная дзяржаўная мерапрыемства. Задача партыйных, совецкіх і комсамольскіх органаў, сельсоветаў, усіх сялян і сялянак шырыць соцыялістычнае спаборніцтва на хлебанарыхтоўках і дабіцца ў бліжэйшыя дні поўнага выканання плана здачы хлеба дзяржаве.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ БЕРЛІНСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ТРОХ ДЗЯРЖАЎ

(ЗАКАНЧЭННЕ ПАЧАТАК У № 31 (51) і № 32 (52)

### В. Спіс дэлегацыі Злучаных Штатаў Амерыкі

Прэзідэнт—ГАРЫ С. ТРУМЭН,
Дзяржаўны Сакратар ДЖЭМС Ф. БІРНС,

Адмірал Флота ВІЛЬЯМ Д. ЛЕГІ, Начальнік Штаба Ваенна-Марскога Флота ЗША пры Прэзідэнце,

ДЖОЗЕФ Е. ДЭВІС—спецыяльны Пасол, ЭДВІН ПОУЛІ, спецыялны Пасол, В. АВЕРЭЛ ГАРЫМАН, Пасол у СССР.

Генерал арміі ДЖОРДЖ С. МАРШАЛ, Начальнік Штаба Арміі Злучаных Штатаў,

Адмірал Флота ЭРНСТ Д. КІНГ, Начальнік Аператыўнага Аддзела Ваенна Марскога Флота ЗША і Галоўнакамандуючы Флотам ЗША,

Генерал Арміі Г. Г. АРНОЛЬД, Паветраныя сіл ЗША

Генерал-лейтэнант БРЭГ ОН Б. СОМЕРВЕЛ, Камандуючы армейскай Службай,

Віцэ-Адмірал ЭМОРЫ С. ЛЕНД, Начальнік Ваенна-Марскога Транспарта,

ВІЛЬЯМ Л КЛЕЙТОН, Памочнік Дзяржаўнага Сакратара.

ДЖЭМС С. ДАН, Памочнік Дзяржаўнага Сакратара,
БЕН КОГАН, Спецыяльны Памочнік Дзяржаўнага Сакратара,

Г. ФРЫМЕН МЭЦЬЮС, Дырэктар Еўрапейскага Аддзела Дзяржаўнага Дэпартамента,

ЧАРЛЬЗ Е. БОЛЕН, Памочнік Сакратара (разам з палітычным, ваеннымі і тэхнічнымі советнікамі).

### С. Спіс дэлегацыі Злучанага Каралеўства

Прэм'ер Міністр:
пан УІНСТОН С. ЧЭРЧЫЛЬ,
пан К. Р. ЭТЛІ,
Міністр Замежных Спраў:
пан АНТОНІ ІДЭН,
пан ЭРНЕСТР БЕВІН,
Лорд ЛЕЗЕРС, Міністэрства Ваеннага Транспарта,

Сэр АЛЕКСАНДР КАДАГАН, пастаянны Намеснік Міністра Замежных Спраў,

Сэр АРЧЫБАЛЬД КЛАРК КЕР, Пасол Яго Вялікасці ў Маскве,

Сэр ВАЛЬТЭР МАНКТОН, Глава дэлегацыі Злучанага Каралеўства ў Маскоўскай Рэпарацыйнай Камісіі,

Сэр ВІЛЬЯМС СТРЭНГ, палітычны Советнік Галоўнакамандуючага Брытанскай зонай акупацыі ў Германіі,

Сэр ЭДВАРД БРЫДЖЭС, сакратар Кабінета Міністраў,

Фельдмаршал сэр АЛАН БРУК, начальнік Імперскага Генеральнага Штаба,

Маршал Каралеўскіх Паветраных Сіл, сэр ЧАРЛЬЗ ПАРТАЛ, начальнік штаба авіяцыі,

Адмірал Флота сэр ЭНДРЮ КАНІНГЭМ, першы Марскі Лорд,

Генерал сэр ХАСТЫНГС ІСМЕЙ, начальнік штаба Міністра Абароны,

Фельдмаршал сэр ГАРОЛЬД АЛЕКСАНДЭР, Саюзны Вярхоўны Камандуючы на Міжземнаморскім тэатры ваенных дзеянняў,

Фельдмаршал сэр ГЕНРЫ МЭЙТЛАНД ВІЛЬСОН, Глава Брытанскай Місіі ў Аб'яднаным Штабе ў Вашынгтоне і другія советнікі,

**І. СТАЛІН**
**Гары ТРУМЭН**
**К. Р. ЭТЛІ**

## Не дапамагаюць моладзі

(ПІСЬМО У РЭДАКЦЫЮ)

Ва ўсім рабочым калектыве Івацэвіцкага спіртзавода значнае месца займаюць маладыя рабочыя. Комсамольская арганізацыя завода прыкладае вялікія намаганні, каб наладзіць сярод моладзі жывую творчую рэботу, арганізаваць цікавыя гурткі, павысіць ідэйна-палітычны ўзровень маладых рабочых.

Аднак, вырашаючы практычна тое або іншае пытанне, мы сустракаем цэлы рад перашкод.

На вялікі жаль дырэкцыя не жадае адклікнуцца на нашы пачынанні, не прыслухоўваецца к патрэбам маладых рабочых.

Кандыдат у члены партыі тов Машанкова лічыць не сваёй справай дапамагчы Комсамольскай арганізацыі ў наладжванні паліт-масавай і культурна-асветнай работы сярод маладых рабочых у выхаванні іх ў комуністычным духу.

Дырэктар завода тов. Карсякоў не гледзячы на тое, што даўно приступіў да сваіх абавязкаў, усё яшчэ „знаёміцца“ з работай і не ўнікае ў дзейнасць камсамольскай арганізацыі, не падтрымлівае яе ініцыятывы.

У выніку, сярод рабочых не праводзіцца чытка газет, даклады, гутаркі. Усё гэта можна з поспехам арганізаваць пры жаданні дырэкцыі і комуністаў завода.

Рабочыя завода.

## ЗВОДКА

Аб ходзе ўборкі ураджаю ў разрэзе сельсоветаў на 18 жніўня г.г.

| Назва сельсоветаў | Процант выканання |
|---|---|
| 1. Івацэвіцкі | 100 |
| 2. Яблонскі | 90 |
| 3. Белавіцкі | 85 |
| 4. Любішчыцкі | 82 |
| 5. Яглевіцкі | 80,5 |
| 6. Сенькавіцкі | 79 |
| 7. Падстарынскі | 78,4 |
| 8. Гошчаўскі | 74,9 |
| 9. Жытлінскі | 73,7 |
| 10. Альшаніцкі | 71,1 |
| 11. Стайкаўскі | 68,6 |
| 12. Грыўдзенскі | 66,4 |
| 13. Косаўскі | 64,8 |
| 14. Бусяжскі | 54,2 |
| 15. Альбінскі | 52,6 |
| Усяго па раёну | 87,8 |

Адказны рэдактар А. П. РУДОЙ.